NEWSLETTER BELARUS Live www.Belarus-Live.eu 16.10.2008 — 23.10.2008

**Савет Рэспублікі ўхваліў жорсткі законапраект аб абароне інфармацыі**

**Дыпляматычны нонсэнс**

**Беларускія зялёныя ў Эўропе**

**АДС хочуць зьмяніць Выбарчы й Крымінальны кодэксы**

**Перавага Беларусі ў фінансавым крызысе – камандная эканоміка**

**Музэй Яна Паўла II у беларускім Парыжы**

У Беларусі ідзе падрыхтоўка да зьездаў двух найбуйнейшых дзяржаўна-грамадзкіх аб'яднаньняў – «Белая Русь» і БРСМ (Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі). Кіраўніцтва гэтых арганізацыяў чакае падтрымкі дзяржавы, дзяржаўная ж улада спадзяецца, што яны змогуць функцыянаваць самастойна.

Першы зьезд рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Белая Русь» заплянаваны на 25 кастрычніка ў Палацы Рэспублікі. Старшынём арганізацыі зьяўляецца міністар адукацыі Аляксандар Радзькоў. У мерапрыемстве прымуць удзел 400 дэлегатаў з усіх вобласьцяў і Менску. 51 дэпутат новага скліканьня ніжняй палаты парлямэнту зьяўляецца чальцамі аб'яднаньня. Пры гэтым чальцы «Белай Русі» падчас выбарчай кампаніі ніяк ня ўказвалі на сваю прыналежнасьць да гэтай арганізацыі. У верхняй палаце – Радзе Рэспублікі чальцы аб'яднаньня складаюць каля чвэрці новых сэнатараў. «Белая Русь» аб'ядноўвае больш за 75 тыс. чалавек. Першы зьезд «Белай Русі» неаднойчы пераносіўся, паколькі заставалася незразумелым пытаньне пра маштабы дзяржаўнай падтрымкі аб'яднаньня.



photo.bymedia.net

29 кастрычніка павінен адбыцца зьезд грамадзкага аб'яднаньня «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», чальцамі якога зьяўляюцца 490 тыс. чалавек. Паводле некаторых дадзеных, у Адміністрацыі прэзыдэнта пачало насьпяваць сур'ёзнае незадавальненьне тым, што грошы ў арганізацыю ўносяцца мільярдамі, а аддача атрымліваецца на капейкі. З аналітычных дакладаў сілавых структураў пачала паступаць інфармацыя пра тое, што некаторыя кіраўнікі арганізацыі як у цэнтральным апараце, так і ў рэгіёнах занадта вольна абыходзяцца з вылучанымі ім сродкамі. Адміністрацыя настаяла на зьмене кіраўніцтва аб'яднаньня: у ліпені бягучага году на чарговым пленуме ЦК БРСМ першы сакратар Леанід Кавалёў быў вызвалены ад займанай пасады, а на яго месца




абраны новы – Юры Крывадубскі, які раней займаў пасаду намесьніка старшыні Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ. Затым адбылася зьмена першых сакратароў у рэгіянальных аддзяленьнях БРСМ.

СМІ завастраюць праблемы дзяржаўна-грамадзкіх аб’яднаньняў, зьмяшчаючы пэрспэктывы іх разьвіцьця ў строга альтэрнатыўныя рамкі: альбо дзяржава ўсімі спосабамі надасьць ім падтрымку, альбо зачыніць іх. Між тым няма падставаў для падобных рашэньняў. Дзяржава гатовая выдаткоўваць пэўныя сродкі на падтрымку масавых аб’яднаньняў, выкарыстоўваючы іх у якасьці пратэзу, што замяняе разьвітую грамадзянскую супольнасьць. Зь іншага боку, дзяржаўны апарат і кіраўніцтва краіны не бачыць неабходнасьці ў фармаваньні «партыі ўлады», справядліва баючыся сустрэчнай залежнасьці ад такой партыі, калі яна сапраўды ўмацуецца – незалежна ад таго, наколькі будзе ляяльнай у дачыненьні да кіруючай групоўкі такая партыя. Незадаволенасьць жа ўладаў і БРСМ, і «Белай Русьсю» выкліканая найперш тым, што гэтыя масавыя арганізацыі дрэнна выконваюць ускладзеныя на іх функцыі – яны ня здольныя ні замяніць, ні нават стварыць бачнасьць грамадзянскай актыўнасьці. Абедзьве арганізацыі пакуль здольныя толькі выкарыстоўваць дзяржаўныя прэфэрэнцыі для падтрымкі свайго кіраўніцтва. Відавочна, што дзяржава, надаючы прэфэрэнцыі, чакае, што яны павінны забясьпечыць аўтаномнае функцыянаваньне гэтых аб’яднаньняў, то бок без падтрымкі зь дзяржбюджэту і ўрадавых фондаў.

Заўважнай падзеяй у Беларусі стала публічнае прызнаньне міністра эканомікі Мікалая Зайчанкі ў тым, што Беларусь сутыкаецца ня толькі з прамымі наступствамі ўсясьветнага фінансавага крызысу. «У нас не разьвіты рынак каштоўных папераў, таму прамых стратаў менш. Там, дзе ідуць крызысныя працэсы і ёсьць запаволеньне – у Расеі і ЭЗ – попыт на беларускую прадукцыю памяншаецца, што стварае цяжкасьці для падтрыманьня высокіх тэмпаў разьвіцьця нашай эканомікі», – сказаў М. Зайчанка.

Сапраўды, зь верасьня продажы МАЗ на расейскім рынку скараціліся на 20%. Для пераадоленьня спаду продажаў на мінулым тыдні было вырашана, што МАЗ у партнэрстве з ААТ «Белзьнешэканомбанк» да канца 2008 г. дадуць лізінгавай кампаніі ААТ «МазКантрактЛізінг» фінансаваньне ў аб’ёме да USD10 млн. для стварэньня канкурэнтнай перавагі на крызысным расейскім рынку.

Намесьніца міністра эканомікі Тацьцяна Старчанка адзначыла, што магчымымі наступствамі глябальнага крызысу стане скарачэньне вонкавага крэдытаваньня краіны і плянаў прыцягненьня інвэстараў. Яна нагадала, што ў 2007 г. вялікі аб’ём крэдытных рэсурсаў быў прыцягнуты з рэсурсавай базы расейскіх банкаў, якія ў сваю чаргу ажыцьцяўлялі запазычаньні на замежных рынках і крэдытавалі беларускія прадпрыемствы. «Тым ня менш, амбіцыёзныя задачы прыцягненьня інвэстыцыяў у эканоміку з парадку дня не здымаюцца. Таму мы не спыняем інтэнсіўную падрыхтоўку беларускага інвэстыцыйнага форуму ў Лёндане, які адбудзецца 16–19 лістапада», – сказала намесьніца міністра.

Паводле зьвестак, перададзеных СМІ крыніцай у беларускім урадзе, расейскія кампаніі згубілі цікавасьць да інвэстыцыйных праектаў у нафтахіміі. У прыватнасьці, кампанія «СІБУР Мінугнаеньні» гатовая была разгледзець пытаньне набыцьця кантрольнага пакету акцыяў ААТ «Гродна Азот» і забясьпечыць варыянты прамых паставак газу для патрэбаў гэтага прадпрыемства. Цяпер перамовы замарожаныя. Тое ж тычыцца плянаў прыватызацыі «Нафтан», «Палімір» ды інш.

Намесьнік дырэктара па навуковай працы Інстытуту эканомікі Мінэканомікі Беларусі Ўладзімер Пінігін, выступаючы на канфэрэнцыі «Праблемы прагназаваньня і дзяржаўнага рэгуляваньня сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця», выказаў меркаваньне, што Беларусь уступіла ў стадыю «перагрэву» эканомікі і гэта дыктуе неабходнасьць яе мадэрнізацыі. Варта прыняць меры, не чакаючы стагнацыі. «Стандартны набор «лекавых» сродкаў ад перагрэву эканомікі, вядомы ў сьвеце, – гэта мадэрнізацыя вытворчасьцяў, прыцягненьне інвэстыцыяў, трансфармацыя структуры эканомікі, кардынальная зьмена інстытутаў кіраваньня эканомікай», – распавёў экспэрт.

З гэтай мэтай Інстытут эканомікі Мінэканомікі Беларусі распрацаваў канцэпцыю мадэрнізацыі нацыянальнай эканомікі. У цяперашні час дакумэнт узгадняецца з галіновымі органамі дзяржкіраваньня.

17 кастрычніка на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніком НББ Пятром Пракаповічам было вырашана падрыхтаваць указ прэзыдэнта пра тое, што ў Беларусі будуць прадугледжаныя дзяржаўныя гарантыі па ўсіх банкаўскіх унёсках незалежна ад іх велічыні, а таксама дазволены прыём унёскаў ня толькі ад беларускіх, але і ад




photo.bymedia.net

замежных грамадзян у неабмежаваных аб’ёмах, без дэкларацыяў, з поўным трыманьнем у таямніцы памераў унёскаў у адпаведнасьці зь беларускім заканадаўствам.

Акрамя таго, А. Лукашэнка даручыў Нацбанку тэрмінова ўнесьці на разгляд нарматыўныя дакумэнты, якія дазволяць Беларусі ўвайсьці ў лік першых 30 краінаў-лідэраў у сьвеце па стварэньні спрыяльных умоваў крэдытаваньня.

АФІЦЫЙНА

## Савет Рэспублікі ўхваліў жорсткі законапраект аб абароне інфармацыі

***Верхняя палата беларускага парлямэнту ўхваліла праект закону аб абароне інфармацыі.***

Законапраект “Аб інфармацыі, інфарматызацыі й абароне інфармацыі” быў прыняты Палатай прадстаўнікоў 9 кастрычніка.

Як сьцьвярджаюць аўтары закону, ён павінен рэглямэнтаваць парадак доступу грамадзянаў да інфармацыі, рэгуляваць пытаньні абмену інфармацыяй і меры яе абароны, вызначаць правы і абавязкі ўладальнікаў і ўласьнікаў праграмна-тэхнічных сродкаў.

Але незалежныя экспэрты лічаць, што закон яшчэ больш звужае інфармацыйную прастору ў Беларусі. Паводле словаў юрыста Міхаіла Пастухова, новы закон парушае артыкул 33 і 34 Канстытуцыі краіны, якая гарантуе доступ грамадзянаў да інфармацыі.

Новы закон набудзе моц праз шэсьць месяцаў пасьля афіцыйнай публікацыі.

ПАЛІТЫКА

## Дыпляматычны нонсэнс

***Парлямэнтам Абхазіі й Паўднёвай Асэтыі нададзены статус пастаянных назіральнікаў пры Парлямэнцкай асамблеі Саюзу Беларусі й Расеі.***

Такое рашэньне прынятае сёньня падчас 34-й сэсіі Парлямэнцкага сходу, які адбываецца ў Маскве, паведамляе агенцтва БелТА. З просьбай пра прызнаньне статусу назіральнікаў у Парлямэнцкі сход зьвярнуліся парлямэнты Абхазіі й Паўднёвай Асэтыі.

У сувязі з гэтым паўстае пытаньне: ці не прызнала Беларусь ускосна незалежнасьць гэтых дзьвюх грузінскіх сэпаратысцкіх рэспублік? Бо, прызнаючы такі статус Цхінвалі й Сухумі, Парлямэнцкая асамблея Саюзу Беларусі й Расеі павінна была прызнаць яго прававы суб’ект. Беларусь не прызнала незалежнасьць Паўднёвай Асэтыі й Абхазіі, адпаведна, для афіцыйнага Менску не існуе адміністрацый гэтых краін.

Старшыня камісіі Парлямэнцкага сходу па пытаньнях замежнай палітыкі Мікалай Чаргінец лічыць, што ніякай супярэчнасьці няма.




М. Чаргінец: “Ня бачу ніякіх праблемаў (ані палітычных, ані этнічных) у тым, што мы даем статус назіральнікам парлямэнту Паўднёвай Асэтыі й Абхазіі”.

Ён нагадаў, што і раней сход даваў такі статус ня толькі парлямэнтам некаторых краін, але й розным міжнародным арганізацыям.

ГРАМАДЗТВА

## Беларускія зялёныя ў Эўропе

***Беларуская партыя “Зялёныя” атрымала статус назіральніка ў Эўрапейскай партыі зялёных, паведамляе БелаПАН. Рашэньне было прынята на кангрэсе Эўрапейскай партыі зялёных, які днямі прайшоў у Парыжы.***

Зь ініцыятываю выступілі самі беларускія зялёныя.Статус назіральніка зьяўляецца пераходным этапам да членства ў партыі. Пераходны этап доўжыцца каля трох гадоў. Згодна з статутам ЭПЗ, беларуская партыя зможа стаць паўнавартасным чальцом эўрапейскай партыі.

“Мы разглядаем такое рашэньне як вельмі важны крок, які ўзмоцніць пазыцыю беларускага экалягічнага руху”, – адзначыў лідэр БПЗ Алег Новікаў. Ён падкрэсьліў, што ЭПЗ зьяўляецца трэцяй па велічыне партыяй у Эўрапейскім парлямэнце. Членства беларусаў у ЭПЗ дало б магчымасьць уздымаць пытаньне экалёгіі ў Беларусі на самым высокім узроўні.

АПАЗЫЦЫЯ

## АДС хочуць зьмяніць Выбарчы й Крымінальны кодэксы

***Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы намерваюцца зьмяніць Выбарчы й Крымінальны кодэксы Беларусі. Дзеля распрацоўкі новых кодэксаў ужо створаная працоўная група.***

У АДС падкрэсьліваюць, што зьмены ў выбарчым заканадаўстве патрэбныя, каб у Беларусі адбываліся выбары, а ня выбарчая кампанія. У сваю чаргу ў Крымінальным кодэксе трэба зьмяніць артыкулы, якія прадугледжваюць адказнасьць за дзейнасьць у палітычных ці грамадзкіх арганізацыях. Таксама апрацаваныя прапановы па стварэньні роўных умоваў працы дзяржаўных і незалежных СМІ, а таксама прапановы па лібэралізацыі ўмоваў дзейнасьці няўрадавых арганізацыяў і палітычных партый.

ЭКАНОМІКА

## Перавага Беларусі ў фінансавым крызысе – камандная эканоміка

***Беларусь ва ўмовах сусьветнага фінансавага крызысу мае шэраг перавагаў, заявіў сёньня старшыня Рады дзелавога супрацоўніцтва “Беларусь – ЭЗ” Джэймс Уілсан, выступаючы на Беларускім фінансава-інвэстыцыйным форуме ў Менску – паведамляе БелТА.***

Сярод перавагаў ён назваў высокакваліфікаваныя рабочыя кадры, умовы вытворчай дзейнасьці, якія могуць зацікавіць кампаніі, што жадаюць зьнізіць выдаткі на вытворчасьць. Ва ўмовах фінансавага крызысу краіны, у якіх ёсьць элемэнты каманднай эканомікі, безумоўна, маюць перавагі.

Джэймс Уілсан таксама адзначыў, што цяжка прадказаць умацаваньне рэгіянальнай пазыцыі Беларусі й пераплыў у яе капіталу з эўрапейскіх краінаў, дзе рынкі перажываюць стагнацыю.

Дзелавая Рада “Беларусь – ЭЗ” створаная ў траўні 2007 году, гэта некамэрцыйная арганізацыя, зарэгістраваная й разьмешчаная ў Брусэлі. Асноўны напрамак дзейнасьці гэтай арганізацыі – разьвіцьцё адносінаў Беларусі з Эўразьвязам, найперш у гандлёва-эканамічнай галіне.

КУЛЬТУРА

## Музэй Яна Паўла II у беларускім Парыжы

***Адкрыцьцё музэю Яна Паўла II, асьвячэньне касьцёла й імправізаванай “Эйфэлевай вежы” адбылося ў вёсцы Парыж Віцебскай вобласьці. Мерапрыемствы адбыліся па ініцыятыве пробашча вёскі Мосар Ёзафа Булькі.***

Сьвятар адзначыў, што беларуская Эйфэлевая вежа адрозьніваецца ад парыскай тым, што на ёй устаноўлены хрысьціянскі крыж. Вежа ўяўляе зь сябе жалезную канструкцыю з пляцоўкай, зь якой бачная вёска. Побач стаяць фігуры двух анёлаў і Маткі Боскай.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

ERB
EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap.
The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.